# Міжнародны дзень абароны дзяцей



Да Міжнароднага Дня абароны дзяцей супрацоўнікі "Нацкі культурна-краязнаўчы цэнтр" і сельская бібліятэка запрасілі дзяцей малодшага ўзросту на свята "Вясёлка планеты дзяцінства". Сустрэлі дзяцей Мальвіна,Клоўн і Карлсан. На паравозіку дзяцінства адправіліся ў бібліятэку, дзе дзеці адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны, на жартоўныя пытанні аб казачных героях. За актыўны ўдзел усе атрымалі салодкія прызы. У філіяле "Пераганцаўская сельская бібліятэка" прайшла конкурсна-забаўляльная праграма "Лета кліча дзеці вас, да чытання кніг у нас". Дзеці адгадвалі назвы папулярных дзіцячых песень, адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны, адгадвалі, каму належыць казачныя рэчы, успаміналі казачныя сродкі руху, адказвалі на жартоўныя пытанні аб казачных героях. Спадабалася хлопчыкам і дзяўчынкам гульня “Ах, мой венік удалы!”



Філіял “Канвелішскя сельская бібліятэка” запрасіла наведвальнікаў дзіцячага сада на конкурсна-забаўляльную праграму “Лета кліча дзеці вас, да чытання кніг у нас”. Дзеці разам з выхавацелямі ўдзельнічалі ў жартоўных конкурсах, разгадвалі загадкі, інсцэніравалі казку “Калабок”. З добрым настроем і салодкімі падарункамі дзеці сустрэлі пачатак лета.

Дзяцінства – шчаслівая вясёлая пара. З гэтай нагоды ў ф-ле “Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка”да Дня абароны дзяцей прайшла конкурсна-забаўляльная гульня “Краіна дзяцінства” з дзецьмі аздараўленчага лагера. На мерапрыемстве прысутнічала старшыня Бастунскага выканаўчага камітэта С. А. Нямера, якая павіншавала дзяцей са святам і пажадала дзецям добрага настрою і адпачынку. У госці да дзяцей завітала фея Лета, казачны персанаж Баба Яга. З вялікім задавальненнем дзеці ўдзельнічалі ў рухомых гульнях і конкурсах, адказвалі на пытанні віктарыны, прымалі ўдзел у конкурсе вершаў пра лета. Добры настрой, салодкія пачастункі спрыялі добраму настрою дзяцей.

У першы летні дзень на тэрыторыі філіяла "Тракельская сельская бібліятэка" адбылася ігратэка "Детство - красак радуга ", прыўрочанае да Міжнароднага дня абароны дзяцей. Мерапрыемства наведалі дзеці дашкольнага і школьнага ўзросту. Падчас свята ў госці завіталі клоўны Клёпа і Тоша, а таксама Баба Яга і Васіліса, якія рознымі гульнямі і спаборніцтвамі вясялілі дзетак, адорвалі іх цукеркамі .Ніхто не сумаваў на свяце, добраму настрою спрыяла сонечнае надвор'е, вяселая музыка і добры настрой удзельнікаў.



У філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” прайшла гадзіна вясёлых задум “Хай дзяцінства звонкае смяецца”. Дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў конкурсе загадак, віктарыне “Узнай сказку по описанию”, літаратурных гульнях, турнірах, разгадвалі крыжаванкі.

“Воранаўская дзіцячая бібліятэка” падрыхтавала конкурсна - забаўляльную праграму “Лета кліча дзеці вас, да чытання кніг у нас”. Была прадстаўлена кніжная выстава “Лепшыя кнігі дзяцінства”, праз якую дзеці пазнаёміліся з новым, цікавымі і маляўнічымі выданнямі. А таксама дзетвара з задавальненнем удзельнічала ў казачных віктарынах, разгадванні загадак і забаўляльных гульнях. У завяршэнні свята дзеці прынялі ўдзел у конкурсе малюнкаў на асфальце “Детство — Планета Счастья”. Дырэктар раённага дзіцячага фонда Таццяна Сушынская павіншавала дзяцей з святам і ўручыла каштоўныя падарункі. Свята падаравала ўсім прысутным добры настрой, радасць, вяселле і ўсмешкі.



# Адкрыццё дзіцячага іміджавага пакоя



У філіяле «Воранаўская дзіцячая бібліятэка» адкрыўся іміджавы пакой МНС «Обучайка» - абсталяваны пакой бяспекі. Тут можна праводзіць рухомыя гульні па асновах бяспекі жыццядзейнасці, размясціліся цацачныя мадэлі пажарнай тэхнікі, навучальны дом, які дазваляе змадэляваць сітуацыі, калі дзецям неабходна выклікаць ратавальнікаў і як неабходна дзейнічаць самім. Навучанне дзяцей правілам пажарнай бяспекі мае каласальнае значэнне. Дзіця атрымае тыя веды, якія будзе выкарыстоўваць ўсё жыццё.





# За здаровы лад жыцця

Філіял "Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка" правёў віктарыну "Быць здаровым – проста здорава" да Сусветнага Дня здароўя з вучнямі 3 класа. Мэтай мерапрыемства стала фарміраванне ў дзяцей навыкаў правільнага харчавання, беражлівыя адносіны да свайго здароўя. Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны, адгадвалі загадкі. Да ўвагі маленькіх вучняў была паказана прэзентацыя "Здаровы лад жыцця".

У філіяле "Місявіцкая сельская бібліятэка" для падлеткаў была падрыхтавана выстава-перасцярог "Асцярожна, ліха!" да Сусветнага дня памяці ахвяр ад СНІДа. Праведзены набат памяці "Ведаеш, так хочацца жыць!", дзе юнакі і дзяўчаты даведаліся аб тым, як хочацца жыць маладым людзям, якія ўжо даведаліся аб гэтай страшнай хваробе, а вылячыцца ўжо немагчыма. У заключэнні прайшло абмеркаванне дадзенага мерапрыемства.

Да Сусветнага дня памяці ахвяр ад СНІДа філіял "Воранаўская дзіцячая бібліятэка" запрасіў сваіх чытачоў звярнуць увагу на выставу – перасцярогу "СНІД не выбірае – выбіраеце Вы". Наведвальнікі бібліятэкі мелі магчымасць пазнаёміцца з кнігамі, перыядычнымі выданнямі, буклетамі ў якіх вядзецца размова пра цяжкае захворванне СНІД, пашырыць свае веды і зрабіць для сябе правільныя вынікі перасцярогі заражэння.

# Дзень Чарнобыльскай трагедыі




Воранаўская раённая бібліятэка запрасіла вучняў 9 "Б" класа на ўрок памяці "Чарнобыль - боль, які спальвае сэрцы". Чарнобыльская аварыя закранула лёсы мільёнаў людзей. Была афармлена кніжна-ілюстраваная выстава "Чарнобыль у памяці і кнігах". Пра тое, як далікатны навакольны нас свет, аб трагедыі Чарнобыля, пра подзвіг людзей-ліквідатараў аварыі расказалі дзецям бібліятэкары Воранаўскай бібліятэкі. Мерапрыемства суправаджалася прэзентацыяй «Чарнобыль: трагедыя, подзвіг, папярэджанне...».

Філіял "Воранаўская дзіцячая бібліятэка" правёў гадзіну памяці "Чарнобыль – хроніка цяжкіх дзён". Трыццаць два гады ўспамінаў і болі… Вучні пазнаёміліся з хронікай Чарнобыльскай трагедыі праз перыядычныя выданні, чыталі вершы пра Чарнобыль.

Экалагічную гадзіну "Гэта горкае слова-Чарнобыль" з вучнямі Радунскай СШ і выхаванцамі Радунскай школы-інтэрната правялі супрацоўнікі Радунскай гарпасялковай бібліятэкі.

## Аматарскія аб’яднанні запрашаюць.

На працягу некалькіх гадоў аматарскае аб'яднанне "Знаходка", якое дзейнічае пры філіяле "Місявіцкая сельская бібліятэка", пад кіраўніцтвам бібліятэкара Карпук Ліліі Канстанцінаўны вядзе даследчую працу і сабірае матэрыялы аб гісторыі сваёй малой радзімы. Гэта: прыказкі і прымаўкі, народныя святы, традыцыі, звычаі і абрады нашых продкаў. Увесь краязнаўчы матэрыял афармляецца ў тэматычных папках і даносіцца да чытачоў. Але, як кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым дзесяць раз учуць. У мінулым годзе бібліятэкар сумесна з музеям "Спадчына" Забалацкага НПК па сабранаму матэрыялу распрацавалі сцэнарыі абрадаў "Заручыны", "Вяселле", "Уваходзіны". Так, у бібліятэцы адбылося свята фальклору - абрад "Уваходзіны". На пачатку свята бабуля з дзядулям распавядалі сваёй унучцы, а таксама і гледачам, аб тым, як раней святкавалі "наваселле", якія падарункі дарылі, у якім месцы будавалі хату, якія звычаі існавалі, перш чым засяліцца ў новы дом. А затым запрасілі гасцей на "уваходзіны" да цёткі Ганны і дзядзькі Сцяпана. Шмат цікавага з убачанага даведаліся нашы чытачы, напрыклад: як прынімалі гасцей, чым частавалі якое адзенне насілі раней нашы бабулі і дзядулі, што абувалі, якія песні спявалі, якія цікавыя гісторыі, байкі, казкі ведалі. Свята ўдалося на славу.





## Духоўна – маральнае выхаванне



У філіяле "Місявіцкая сельская бібліятэка" адбылася велікодная сустрэча з пажылымі людзьмі "Свечка велікодная запаліцца", прысвечаная вялікаму святу Вялікадня. Удзельнікі мерапрыемства за велікодным сталом, які самі ж і падрыхтавалі, казалі аб велікодных традыцыях і сімвалах. Усе прынеслі з сабой галоўны сімвал Пасхі - яйка і расказвалі аб сваіх звычаях у сям'і, пра спосабы ўпрыгажэнні яйкі, дзяліліся рэцэптамі страў велікоднага стала. Бібліятэкар Карпук Лілія Канстанцінаўна распавяла пра тое, як святкуюць галоўнае свята ў розных краінах свету. Якія б ні былі традыцыі і звычаі, сутнасць свята Вялікадня ўсюды аднолькавая. Святло, любоў і надзею, якія яна нясе цяжка пераацаніць. З вялікім задавальненнем нашы жанчыны адгадвалі загадкі, з азартам гулялі ў гульні за сталом, спявалі духоўныя песні, чыталі вершы. У заключэнні свята была разыграна бяспройгрышная латарэя. Дню памяці Еўфрасінні Полацкай, які адзначаўся 5 чэрвеня, філіял “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” падрыхтаваў для дзяцей аздараўленчага лагера “Планета фантазий” трэцяга атрада “Непоседы” выставу - прысвячэнне “Свайму часу і вечнасці”. Бібліятэкар расказала пра жыццё Святой, яе служэнне Богу і народу, пра гісторыю стварэння Крыжа, які зрабіў ювелір Богша Лазар. Удзельнікі мерапрыемства адказалі на пытанні віктарыны.

## З любоў да роднага краю

Воранаўская зямля багата знакамітымі людзьмі, якія сваёй працай прыносяць карысць свайму народу. 60 гадоў назад у вёсцы Салтанішкі нарадзіўся Віктар Уладзіміравіч Шэйман – дзяржаўны дзеяч Беларусі. Філіял “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” з гэтай нагоды адзначыў юбілей вядомага земляка. Бібліятэкары расказалі вучням пра маладыя гады жыцця, пра станаўленне Віктара Шэймана, як прафесіянала ў сваёй дзейнасці. Наведвальнікам быў прапанаваны прагляд прэзентацыі і артыкулаў з перыядычнага друку. Гутарка “Знакаміты зямляк” падаравала дзецям яшчэ адно знакамітае імя Воранаўшчыны.

## Да Дня славянскага пісьменства і культуры

Сёння, у дзень вялікага свята славянскай цывілізацыі – Дзень славянскага пісьменства і культуры філіял “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” правёў літаратурны рэпартаж “Вытокі славянскага кнігавыдання”. Наведвальнікі бібліятэкі мелі магчымасць пазнаёміцца з славянскімі асветнікамі і прапаведнікамі хрысціянства святыні Кірылам і Міфодзіем, з беларускай першаасветніцай Еўфрасінняй Полацкай, першадрукаром Францыскам Скарынам праз літаратурны рэпартаж прадстаўлены на кніжнай выставе.

Гісторыка – пазнавальная гадзіна “Пісьменнікі славянскага свету” да Дня славянскага пісьменства прайшла ў аддзеле абслугоўвання і інфармацыі Воранаўскай раённай бібліятэкі. Амаль дванаццаць стагоддзяў аддзяляюць нас ад таго часу, калі жылі, тварылі вялікія славянскія асветнікі Кірыл і Мяфодзій. Першанастаўнікі не толькі пераклалі з старажытнагрэцкай мовы на славянскую мову галоўныя хрысціянскія кнігі, але і выхавалі цэлую плеяду вучняў, ад якіх разраслося дрэва вялікай славянскай культуры. Дзень славянскай культуры і пісьменства — свята, прымеркаваны да дня памяці святых роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія, асветнікаў Славенскіх. У Расіі і Беларусі Дзень славянскага пісьменства і культуры адзначаецца як дзяржаўна-царкоўнае свята. На мерапрыемства былі запрошаны вучні 8 «Д» класа Воранаўскай сярэдняй школы. Была аформлена кніжная выстава «Пісьменнікі славянскага свету». На выставе прадстаўлены кнігі аб жыцці і дзейнасці святых Кірыла і Мяфодзія. Раскрываюцца пытанні паходжання ліста, развіцця пісьменства. З кніг чытач даведаецца пра запазычаных у розныя часы слоў, безыменных і знакамітых «рыцараў Слова»: стваральнікаў пісьменства, кнігадрукавання, складальнікі слоўнікаў. Вучні адказалі на пытанні віктарыны.

Пазнавальная гадзіна "Першадрукары і выдаўцы" да Дня славянскага пісьменства прайшла ў філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка”. Пад час мерапрыемства распавядалася пра геніяльных мысліцеляў Ф. Скарыну, М.Гусоўскага, С.Полацкага, Е.Полацкую, К.Тураўскага, пра іх жыццевы шлях, асветніцкую дзейнасць, які значны ўклад унеслі ў развіццё пісьменнасці і кніжных ведаў.

## Сям’я – радуга шчасця

Сям'я – гэта дом. Сям'я – гэта свет, дзе пануюць любоў і адданасць. Гэта радасць і смутку, якія адны на ўсіх. Гэта звычкі і традыцыі. Гэта крэпасць, за сценамі якой могуць панаваць толькі спакой і любоў. Сям'я для кожнага з нас самае галоўнае, самае патрэбнае ў жыцці.



Правядзенне Міжнароднага Дня сям'і служыць павышэнню статусу сям'і і спрыяе лепшаму разуменню яе надзённых праблем і запатрабаванняў. «Ступені сямейнага шчасця», пад такой назвай ў Воранаўскай раённай бібліятэцы адбыўся літаратурна-музычны вечар. У сям'і адбываецца працэс фарміравання чалавека як асобы і як грамадзяніна. Ва ўтульнай чытальнай зале сабраліся госці розных узростаў і поглядаў, але ўсіх іх аб'ядноўвае Любоў і Сям'я. Была аформлена кніжная выстава «Шчасце маё—сям'я», на якой былі прадстаўлены кнігі па сямейным выхаванні, псіхалогіі ўзаемаадносін у сям'і, навінкі літаратуры, а таксама новыя перыядычныя выданні для ўсёй сям'і, і яшчэ аформлена выстава сямейнай творчасці «Свет сямейных захапленняў», дзе госці прадставілі свае працы.



Вядучыя свята пазнаёмілі прысутных з традыцыямі і сімваламі свята. Па-хатняму пілі чай, госці расказалі аб сваіх сем'ях, падзяліліся вопытам доўгай і шчаслівай жыцця, аб сваіх першых спатканнях, пра цяжкасці з якімі прыйшлося сутыкнуцца і пераадолець. Усе гісторыі былі вельмі цікавыя і абсалютна розныя. Прысутным было нечакана даведацца, што-то новае аб людзях, з якімі яны пражылі ў адной мясцовасці не адзін дзясятак гадоў. Весела і актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах, віктарынах, спявалі, прымалі музычныя віншаванні. Свята прайшло ў цёплай, пазітыўнай абстаноўцы.

У завяршэнні свята ўсе ўдзельнікі былі ўзнагароджаны памятнымі падарункамі. Праведзены агляд літаратуры ля кніжнай выставы «Шчасце маё — сям'я».

“Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка” арганізавала выставу-экспазіцыю “Свет сямейных захапленняў” народнай умеліцы вёскі Бастуны Жывулька Ніны Сяргееўны. Свой вольны час Ніна Сяргееўна праводзіць натхнёна. Вяжа, вышывае бісерам абразы, робіць біжутэрыю і падзелкі з бісера.



Філіял “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” запрасіў вучняў малодшых класаў на літаратурны ўрок “Сям’я на старонках любімых кніг”. З дапамогай тэматычнай выставы бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з кнігамі, якія апавядаюць пра сямейныя адносіны бацькоў і дзяцей, унукаў з бабулямі і дзядулямі. Вучні з задавальненнем адгадвалі герояў па ўрыўках з мастацкіх твораў, ўдзельнічалі ў віктарынах, прынялі ўдзел у конкурсе малюнкаў сваёй сям’і. На мерапрыемстве дзеці вучыліся любіць, паважаць і дапамагаць сваім родным і блізкім людзям.

## У згодзе з прыродай

“Вандроўка на экалагічным трамваі” да Сусветнага дня навакольнага асяроддзя – пад такой назвай прайшоў бібліятэчны пікнік ў Пагародзенскай сельскай бібліятэцы. На свежым паветры бібліятэкар пазнаёміла з навінкамі літаратуры і перыёдыкі. Былі прапанаваны: казачная віктарына, лагічная гульня, рэбусы, красворды, загадкі пра прыроду. Пазнаёміліся з казкамі Раісы Баравіковай. На дыванах дзеці ўтульна размясціліся і з захапленнем чыталі журналы і кнігі.

Галоўны прадмет у барацьбе за чысціню нашых вуліц і двароў – мятла. У філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” была праведзена гульнёвая праграма “Вясёлая мятла” для вучняў пачатковых класаў, якія адпачываюць у аздараўленчым лагеры Радунскай СШ. Мэта якой заключалася ў павышэнні экалагічнай культуры дзяцей праз гульні, конкурсы, аўкцыёны і эстафеты. Актыўна удзельнічаючы ў мерапрыемстве, дзеці называлі прадстаўнікоў “Клана чысціні”, успаміналі казкі, у якіх мятла - сродак перамяшчэння. Конкурсы “Самы спрытны”, “Самы гнуткі” і гульня “Злаві метелку” выклікалі нямала смеху і радасці. Заклікам аб выратаванні планеты ад смецця і асцярожным стаўленні да навакольнага свету скончылася мерапрыемства.

Бібліятэкар філіяла "Пераганцаўская сельская бібліятэка" наведала Пераганцаўскі яслі/сад з гульнёй – адгадайка "Вандроўка па старонках кніг беларускіх загадак". Пазнаёміла з навінкамі літаратуры, з казкамі беларускіх аўтараў, а таксама з загадкамі на беларускай мове з кнігі Міхася Пазнякова "Святло дабрыні","Загадкі з поля іградкі","На тычынцы гарадок", зацікавіла маленькіх чытачоў каляровымі кнігамі. Дзеці з цікавасцю слухалі бібліятэкара і адгадвалі загадкі.За правільныя адказы дашкольнікі атрымалі прызы.

Да Сусветнага дня навакольнага асяроддзя філіял “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” правёў экалагічны ўрок “Не шкодзь прыродзе, жыві з ёю ў згодзе” з дзецьмі аздараўленчага лагера “Планета фантазий” атрада “Улыбка”. Бібліятэкары расказалі пра гістарычнае мінулае, аб тым, як складаўся лёс жывёл і птушак, як бязлітасна былі знішчаны асобыя віды расліннага і жывёльнага свету. Прызывалі дзяцей любіць і зберагаць родную прыроду. Пазнаёмілі з кнігамі аб прыродзе і даведачнымі выданнямі кніжнага фонду .

## Бібліятэка – дзецям

Воранаўская дзіцячая бібліятэка для наведвальнікаў аздараўленчага лагера “Планета фантазий” першага атрада “Непоседы” арганізавала чытанні ў парку “Канікулы з кнігай”. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з цікавымі кніжкамі, якія бібліятэка атрымала ў апошні час. З задавальненнем удзельнічалі дзеці ў літаратурнай гульні, віктарыне, адгадвалі загадкі, а таксама дзеці чыталі вершы пад адкрытым небам. Потым усе прысутныя прынялі ўдзел ў гульнях і конкурсах.

З самага ранняга дзяцінства вы чулі казкі. Калі вы былі маленькімі, вам распавядалі казкі мамы і бабулі, а потым пайшлі ў школу і самі навучыліся іх чытаць. Чытаючы казкі, вы трапляеце ў цудоўны, загадкавы, таямнічы свет. У казках здзяйсняюцца самыя неверагодныя цуды: той змей-Гарыныч выносіць прыгажуню царэўну ў сваі валоданні. То яблынька ўзнагароджвае працавітую дзяўчынку залатымі і сярэбранымі яблычкамі, то хітрушчая ліса падманвае ўсіх. Бібліятэкар філіяла “Больцішская інтэграваная бібліятэка” разам з наведвальнікамі школьнага летніка здзейснілі падарожжа ў гэты загадкавы свет казак “Любімыя казкі - усім сябрам паказкі”. Былі прапанаваныя прыпынкі, дзе дзеці адказвалі на пытанні або адгадвалі казку. Але каб дарога падалася цікавай і нясумнай, гулялі ў гульню "Рамонак". Удзельнікі па чарзе адрывалі пялёсткі ад рамонкі, чыталі пытанне і адказвалі на яго. А на станцыі «Церамок» чакалі цікавыя заданні, віктарына "Ці Ведаеш ты казкі?", дзе дзеці адгадвалі назву казкі. А на наступным прыпынаку, і зноў гулялі ў гульню "Намалюем ката". Па адным чалавеку ад каманды малявалі з завязанымі вачыма. На прыпынку "Церам" героі казак пакінулі тэлеграмы і некаторыя свае рэчы. Дзеці адгадвалі, хто даслаў тэлеграмы. Вось і падышло да канца наша падарожжа. Я бачу, што ўсе вы любіце казкі, ведаеце іх. Але яшчэ ёсць вельмі шмат казак,

не прачытаных вамі. Так што прыходзьце ў бібліятэку за новымі кніжкамі. Філіял "Воранаўская дзіцячая бібліятэка" арганізаваў конкурсна- гульнёвую праграму "Каникулы без скуки" для аздараўленчага лагера "Воранаўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі" атрада "Фантазёры". Бібліятэкары правялі для дзяцей займальныя гульні, конкурсы, віктарыны і настольныя гульні. Дзеці весела правялі свой час.

Бібліятэкар філіяла "Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка" правяла гучныя чытанні "З кніжкай на лаўцы" пад адкрытым небам у дз/садзе. Дзеці пазнаёміліся з найбольш цікавымі кнігамі, з захапленнем слухалі казкі.

## Таленты літаратурнага слова

Да 135 - годдзя з дня нараджэння выдатнага беларускага пісьменніка Янкі Маўра ў Воранаўскай дзіцячай бібліятэцы прайшла літаратурная вандроўка "Прыгоды з дзядзькам Маўрам". З дапамогай кніг, прадстаўленых на кніжнай выставе "З вышыні прамжытага…", бібліятэкары разам з вучнямі прайшліся па жыццёвым і творчым шляху паэта. Адбылося знаёмства з прыгодніцкай аповесцю "ТВТ", папулярнымі аповесцямі "Сын вады" і "У краіне райскай птушкі", з апавяданнямі "Слёзы Тубі", "Незвычайная прынада", "Шчасце" і іншымі. Творы Янкі Маўра і ў сучасны час карыстаюцца вялікім побытам у дзяцей і падлеткаў.

## Дзень Перамогі

Дзень Перамогі – гэта вялікае свята, ён заўсёды будзе самым яркім і незабыўным падзеяй ваеннай гісторыі нашай Айчыны, таму што Перамога здабытая цаной многіх жыццяў, найвялікшага напружання намаганняў усяго нашага народа.



"Воранаўская раённая бібліятэка" прыняла ўдзел ва ўшаноўванні Дня Перамогі ў гарадскім парку, прадэманстраваўшы кніжную выставу «Старонкі гэтых кніг - гісторыя вайны». На ёй былі прадстаўлены кнігі аб вайне, творы пра лёс пакалення, якое прайшло праз агонь бітваў Вялікай Айчыннай вайны.

У філіяле "Воранаўская дзіцячая бібліятэка" прайшлі патрыятычныя чытанні вершаў "Ніколі не забудзем" ля помніка загінуўшых воінаў і партызан і ля памятніка-бюста Героя Савецкага Саюза А.І.Канарчыка. Да помнікаў былі ўскладзены кветкі. Мы помнім аб тых хто загінулі і не забываем аб тых, хто разам з намі, і дзякуем ім за мірнае неба.

Выстава-напамін "Вайна далекая і блізкая" была арганізавана ў Больцішскай інтэграванай сельскай бібліятэцы, якую наведалі вучні 9 класа ДУА "Больцішская базавая школа". Бібліятэкар вяла з прысутнымі гутарку на тэму вайны і перамогі, дзеці актыўна разважалі пра герояў і іх гераічныя ўчынкі, пра смеласць і адданасць сваёй радзіме, якія прысутнічалі ў гады вайны.

Дзень Перамогі філіял "Воранаўская дзіцячая бібліятэка" адзначыў наведваннем ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Сцяпана Аксенцьевіча Жука з віншаваннем ад бібліятэкараў і вучняў першага класа. Дзеці чыталі вершы аб вайне і ўручылі ветэрану падарунак і кветкі.

Напярэдадні Свята Перамогі ў філіяле "Беняконская сельская бібліятэка – музей этнаграфіі" прайшла гадзіна мужнасці "Героі і подзвігі", для вучняў 4-7 класаў ДУА "Беняконская сярэдняя школа". Навучэнцы даведаліся аб тым, што Вялікая Айчынная вайна падняла на барацьбу з фашыстамі не толькі ўсё дарослае насельніцтва краіны, але нараўне з дарослымі ўдзельнічалі ў розных аперацыях і юныя піянеры. Дзеці з цікавасцю слухалі пра подзвігі піянераў-герояў. Увазе наведвальнікаў прадстаўлена выстава літаратуры аб вайне "Вялікі подзвіг народа" . Дапоўніла мерапрыемства выстава-інсталяцыя "Рэчы з франтавога жыцця".У экспазіцыі былі прадстаўлены:баявыя лісткі, салдацкая частка амуніцыі. Каб лепш адчуць эпоху ваенных гадоў ўдзельнікам прадставілася магчымасць здзейсніць імправізаваную ваенна-гістарычнае падарожжа па дарогах вайны. Дзеці атрымалі лісты з заданнямі: "Ліст з фронту". Атрад пісаў ліст , які па змесце перадае ваенную атмасферу, і складалі яго трохвугольнікам. "На сонечнай паляначцы" атрад выконваў песні часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Бібліятэкар філіяла "Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка" сумесна з філіялам "Бастунскі ЦКіД" правяла да Дня Перамогі вечар-партрэт "Тимофеева В.Ф. – дочь трех народов". На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 4-8 класаў. Вера Філіпаўна Цімафеева ветэран Вялікай Айчыннай вайны, якая прымала ўдзел у баях за абарону Масквы. Служыла ў 129 палявым перасовачным шпіталі

медсястрой. Вядучыя мерапрыемства правялі слухачоў дарогай вайны Веры Філіпаўны Цімафеевай. Гучалі вершы пра вайну і віншаванні ветэрану. Да ўвагі прысутнічых была паказана прэзентацыя “Дочь трех держав – Тимофеева Вера Филипповна”.